# ПАСЛАНЬНЕ ЮДЫ

1 Юда, раб Ісуса Хрыста, брат Якава, пакліканым, якія
асьвечаныя Богам Айцом і ахаваныя Ісусам Хрыстом:
2 міласьць вам і мір і любоў хай памножацца.
3 Любасныя! маючы ўсю руплівасьць пісаць вам
пра супольнае збавеньне, я палічыў за патрэбнае
напісаць вам умаўленьне - пасьпрыяць веры, адзін раз
перададзенай сьвятым.
4 Бо пракраліся некаторыя людзі, спрадвеку
прызначаныя на гэтае асуджэньне, бязбожнікі, што
абарочваюць мілату Бога нашага ў нагоду да распусты
і выракаюцца адзінага Валадара Бога і Госпада нашага
Ісуса Хрыста.
5 Я хачу нагадаць вам, хто ўжо ведае гэта, што
Гасподзь, вызваліўшы народ зь зямлі Егіпецкай,
потым пагубіў тых, што ня веравалі,
6 і анёлаў, якія не захавалі сваёй годнасьці, але
пакінулі сваё жытло, трымае ў вечных кайданах, пад
цемрывам, на суд вялікага дня.
7 Як Садома і Гамора і навакольныя гарады, што
падобна да іх блудадзеілі і ўганяліся за іншаю
плоцьцю, дастаўшы кары вагнём вечным, пастаўлены
ў прыклад, -
8 гэтак сама будзе і з гэтымі лятуценьнікамі, якія
апаганьваюць плоць, адмаўляюць начальствы і
ліхасловяць высокія ўлады.
9 Міхаіл Арханёл, калі гаварыў з д'яблам,
спрачаючыся пра Майсеева цела, не адважыўся
вымавіць зьняважлівага выраку, а сказаў: няхай
забароніць табе Гасподзь.

10 А гэтыя ганьбуюць тое, чаго ня ведаюць; а што
з прыроды, як бязмоўныя жывёлы ведаюць, тым і
разбэшчваюць сябе.
11 Гора ім, бо ідуць дарогай Каінавай, упадаюць у
змусту зьдзірства, як Валаам, і ў зацятасьці гінуць, як
Карэй.
12 Такія бываюць спакусай на вашых вячэрах
любові: банкетуючы з вамі, бяз страху напасваюцца;
гэта - бязводныя хмары, што вецер носіць;
восеньскія дрэвы, бясплодныя, двойчы памерлыя,
выкарчаваныя;
13 раз'юшаныя марскія хвалі, што з шумавіньнем
выкідаюць сваю брыду, зоркі вандроўныя, якіх
трымае морак цемрыва навекі.
14 Пра іх прарочыў і Энох, сёмы ад Адама, кажучы:
вось, ідзе Гасподзь з процьмаю сьвятых анёлаў Сваіх
-
15 чыніць суд над усімі і выкрыць усіх сярод іх
бязбожных ва ўсіх справах, якія ад бязбожнасьці
іхняй, і за ўсе жорсткія словы, якімі ганілі Яго
бязбожныя грэшнікі.
16 Гэта - наракальнікі, нічым не задаволеныя,
што ходзяць у сваіх пажадлівасьцях (бязбожна і
беззаконна); вусны іхнія вымаўляюць пыхлівыя
словы; і зважаюць на асобы з карысьлівасьці.
17 Але вы, любасныя, памятайце прадказанае
апосталамі Госпада нашага Ісуса Хрыста;
18 яны казалі вам, што апошнім часам зьявяцца
агуднікі, якія будуць хадзіць у сваіх бязбожных
пахацінствах.
19 Гэта - людзі, якія адлучаюць сябе (ад адзінства
веры), душэўныя, але бяз духу.
20 А вы, любасныя, будуючыся на найсьвяцейшай
веры нашай, молячыся Духам Сьвятым,

21 захоўвайце сябе ў любові Божай, чакаючы міласьці
ад Госпада нашага Ісуса Хрыста, на вечнае жыцьцё;
22 і да адных будзьце літасьцівыя, з разважлівасьцю;
23 а другіх страхам ратуйце, вырываючы з вагню,
выкрывайце са страхам, пагарджаючы нават
вопраткаю, якая апаганена целам.
24 А Таму, Хто можа захаваць вас ад падзеньня
і паставіць перад славаю Сваёю беспахібнымі ў
радасьці,
25 адзінаму, самаму мудраму Богу, Збаўцу нашаму
празь Ісуса Хрыста Госпада нашага, слава: веліч, сіла
і ўлада перад усімі вякамі, сёньня і ўсявечна. Амін.

# Біблія (пераклад В.Сёмухі)
# The Holy Bible in Belarusan
## Белорусское Новый Завет и Притчи

copyright © 2016 John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

Language: Belarusian

Translation by: Antoni Bokun

Contributor: John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

This translation is made available to you under the terms of the Creative Commons Attribution-No Derivatives license 4.0.
You may share, redistribute, or adapt this Bible translation or extracts from it in any format, provided that:

You include the above copyright and source information.

You do not use this work for commercial purposes.

Pictures included with Scriptures and other documents on this site are licensed just for use with those Scriptures and documents. For other uses, please contact the respective copyright owners.

2019-12-29

---

PDF generated using Haiola and XeLaTeX on 21 Feb 2024 from source files dated 29 Jan 2022
5bafea06-5eb3-574c-9054-5e4b38c21bbc